УДК 947.6 «18/19»

У. М. Сцебурака, асістэнт

# САВЕЦКАЯ І СУЧАСНАЯ РАСІЙСКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПА ТЭМЕ ЛЮТАЎСКАЙ І КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫЙ 1917 г.

The article contains soviet and russian historiographical materials about Revolutions of 1917. The periods of historiographical development in USSR and Russian federation are described. The most important works on the topic their authors and conceptions are described. Scientific works dedicated to the Revolution of 1917 their powerful and weak points are marked.

**Уводзіны.** За доўгі час існавання савецкай дзяржавы ўсе тэмы, нейкім чынам звязаныя з падзеямі рэвалюцыйнага 1917 г., мелі надзвычайную важнасць і знаходзіліся пад пільнай увагай даследчыкаў. Стаўленне да падзей рэвалюцый 1917 г. адлюстроўвала ўсе змены ў савецкай гістарычнай навуцы.

Зараз айчынныя і замежныя гісторыкі разглядаюць Кастрычнік 1917 г. хутчэй не як выпадковую з’яву і не як бальшавіцкі пераварот, але як лагічнае, унутрана абумоўленае, сацыяльна-палітычнае дзеянне. Таму яго не толькі магчыма, але і патрэбна разглядаць не адасоблена, а ў агульным рэчышчы падзей, якія папярэднічалі рэвалюцыйным працэсам 1917 г., і бачыць у складанні савецкай палітычнай сістэмы не толькі кастрычніцкія, але і лютаўскія карані.

Сэнс таго, што адбылося ў кастрычніку 1917 г., найбольш яскрава праяўляецца не ў жорсткай класавай барацьбе, як лічылася дзесяцігоддзямі, а ў лёсе дэмакратычнай альтэрнатывы, якая бадай што ўпершыню гэтак магутна праявіла сябе на расійскай прасторы пасля краху царызму. Рэвалюцыйная дэмакратыя ў тыя лёсавызначальныя часы фактычна была па-за канкурэнцыяй, бо мела рэальную сацыяльную падтрымку грамадства, а сацыялістычныя ідэі існавалі ў даволі размытым выглядзе і валодалі масамі як стыхійны выбух.

У гэтых абставінах надзвычай важным бачыцца зварот увагі да пытанняў, што тычацца змен у механізме дзяржаўнай машыны. Адным з найбольш важных складальнікаў падзей рэвалюцыйных часоў з’уляецца комплекс праблем, звязаных з механізмам кіравання дзяржавай. Менавіта пераход ад самаўладдзя да дэмакратыі і пасля да дыктатуры пралетарыяту, канструкцыя сітэмы ўлады на месцах і ў цэнтры, асаблівасці функцыянавання органаў улады на Беларусі, іх суіснаванне на дадзеным этапе патрабуюць дасканалага вывучэння, бо доўгі час заставаліся другараднымі, саступаючы па важнасці палітычнаму напаўненню тых падзей.

**Асноўная частка.** Асновы вывучэння праблемы былі закладзеныя ў перыяд 1920-х гадоў. Найперш, пачалося вывучэнне праблемы ўтварэння Саветаў як органаў улады, іх пераўтварэння ў дзяржаўную сістэму, паслядоўнасці, храналагічных межаў гэтага працэсу [1].

У падобных працах вывучаўся працэс развіцця і ўмацавання Саветаў як органаў дыктатуры пралетарыяту і працэс складання розных дзяржаўных органаў Савецкай Расіі, а таксама іншыя пытанні, што разглядаліся найперш як праблемы класавай барацьбы і інструмент палітычнай барацьбы за ўладу.

Працы 1930-х – першай паловы 1950-х гг. па змесце ў сваёй пераважнай большасці з’яўляліся творамі ідэалагічнымі, г. зн. вырашалі задачы ідэйнага забеспячэння кіравання савецкім грамадствам. У той жа час важнай з’явай было тое, што адбывалася паступовае авалоданне і пераход у гістарычных працах да паслядоўных навуковых форм, што стала першым і неабходным крокам на шляху стварэння прадумоваў навуковага вывучэння станаўлення савецкай палітычнай сістэмы.

З сярэдзіны 50-х гг. з’яўляюцца новыя магчымасці вывучэння элементаў палітычнай сістэмы савецкага грамадства. Грамадская атмасфера ў СССР, якая пазней атрымала назву «адлігі», стварыла прадумовы для адноснага плюралізму ў разглядзе савецкага грамадства і дзяржавы. Гэта выклікала пэўнае пераасэнсаванне папярэдняй палітычнай практыкі і дало магчымасць крытычна ацэньваць некаторыя яе элементы.

У гэты час павялічваецца ўвага гісторыкаў да Кастрычніцкай рэвалюцыі, а таксама да перыядаў, што папярэднічалі і ішлі за ёй. Асноўную ўвагу ўсё ж прыцягвалі першыя гады савецкай улады і грамадзянскай вайны [2].

Тады ж упершыню пачынаецца вывучэнне такіх аспектаў станаўлення савецкай палітычнай сістэмы, як змест, храналагічныя і тэрытарыяльныя межы, злом старога дзяржаўнага апарату, а таксама Лютаўская рэвалюцыя і розныя яе аспекты як прадумовы Кастрычніцкай рэвалюцыі [3].

Напрыканцы 50-х гг. у савецкай гістарыяграфіі пачынаецца пераход ад партыйнай публіцыстыкі да навукова-публіцыстычных прац. Узрастанню элементаў навуковага аналізу ў вывучэнні гісторыі СССР спрыяў больш шырокі доступ даследчыкаў да гістарычных архіваў. На гэтай глебе, звяртаючыся да тэмы Кастрычніцкай рэвалюцыі, гісторыкі імкнуліся паказаць яе супрацьлегласць палітычнай практыцы культу асобы [4]. У другой палове 1950-х – пачатку 1960-х гг. дастаткова шырокае распаў-

сюджванне атрымлівае вывучэнне недзяржаўных элементаў палітычнай сістэмы савецкага грамадства. У прыватнасці, з'яўляецца навуковая цікавасць да іншых партый, якія ўсе ж разглядаюцца як неўласцівы і непатрэбны элемент палітычнай сістэмы Савецкай Расіі. Гэтак пасля дзесяцігоддзяў маўчання з'явілася першае даследаванне па гісторыі небальшавіцкай партыі [5].

Назіраецца колькасны рост прац і па грамадскіх, грамадска-палітычных аб'яднаннях і працэсе іх фарміравання ў перыяд Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай вайны і ў перыяд пачатку мірнага сацыяльна-эканамічнага будаўніцтва [6].

Характарызуючы гістарыяграфію сярэдзіны 1950-х – сярэдзіны 1960-х гг., можна адзначыць, што ў гэты перыяд быў зроблены сур'ёзны крок у даследаванні розных аспектаў станаўлення савецкай палітычнай сістэмы. Дзякуючы пашырэнню базы крыніц за кошт актыўнага выкарыстання рэгіянальных і рэспубліканскіх архіваў быў створаны шэраг абагульняючых навукова-папулярных прац па гісторыі пэўных рэгіёнаў, абласных і рэспубліканскіх арганізацый партый, працягвалася вывучэнне асобных перыядаў станаўлення новай грамадска-палітычнай сістэмы [7]. Адбыўся колькасны рост даследаванняў па праблеме ўсталявання савецкай дзяржавы, яе асобных органаў: апарату кіравання, войска, суда і органаў дзяржаўнай бяспекі. Вырасла колькасць манаграфічнай літаратуры, змяніліся якасць і характар прац [8]. Цэлы шэраг прац быў прысвечаны складванню і функцыянаванню вышэйшых органаў дзяржаўнага кіравання, іх эвалюцыі пад час рэвалюцыі, грамадзянскай вайны і пачатку мірнага сацыялістычнага будаўніцтва [9]. Заўважнай падзеяй гэтага гістарыяграфічнага перыяду стаў выхад у канцы 70-х гг. абагульняючай працы І. Мінца «Гісторыя Вялікага Кастрычніка», якая стала своеасаблівым падсумаваннем вывучэння праблем Кастрычніцкай рэвалюцыі савецкай гістарыяграфіяй [10].

Такім чынам, даследаванні другой паловы 1960-х – першай паловы 1980-х гг. ахапілі большасць аспектаў станаўлення і функцыянавання савецкай сістэмы, застаючыся пры гэтым ў межах ідэалагічнай манаполіі КПСС і вымушана акцэнтуючы ўвагу часам не столькі на навуковых, колькі на ідэйна-палітычных праблемах.

Навейшая гістарыяграфія (з канца 80-х гг. да сучаснасці) пытання станаўлення палітычнай сістэмы Расіі на лёсавызначальнай мяжы 1917 г. мае шэраг асаблівасцей развіцця. Першая – яна развівалася ў працэсе сацыяльнай трансфармацыі савецкага грамадства. Другая – калі да 1991 г. яна існавала фактычна ў межах адзінай пануючай тэарэтыка-канцэптуальнай парадыгмы, то пасля 1991 г. адбываецца ўзбагачэнне гістарычнай навукі адразу ўсімі існуючымі канцэпцыямі гістарычнага развіцця.

У развіцці навейшай гістарыяграфіі можна вылучыць два этапы: з канца 80-х па сярэдзіну 1990-х гг. і з сярэдзіны да нашага часу. Прычым храналагічную мяжу паміж гэтымі этапамі можна правесці, звяртаючы ўвагу на адсутнасць (пасля, адпаведна, наяўнасць) ідэалагічнага кантролю з боку дзяржавы.

На першым этапе, безумоўна, можна адзначыць пашырэнне прадмета вывучэння, увагі да г. зв. «фігур змоўчвання», г. зн. да шэрагу палітычных падзей і асоб рэвалюцыйнага часу ў Расіі. Выяўленыя факты супрацьпастаўляліся міфалагізаванай афіцыйнай гісторыі КПСС і савецкага грамадства. Гэтыя працэсы найбольш заўважна ішлі, найперш, на старонках газетнага друку і літаратурна-мастацкіх часопісаў. Такім чынам, якасныя змены ў гістарыяграфіі гісторыі СССР у гэты перыяд супалі са зменамі ў грамадскай свядомасці савецкага народа, хаця трэба адзначыць, што адыход ад традыцыйных падыходаў даваўся вельмі нялёгка. Так, прыкладам можа быць абароненая ў 1992 г. расійскім даследчыкам С. А. Агапцовым кандыдацкая дысертацыя «Станаўленне партыйна-дзяржаўнай сістэмы ўлады: (Гісторыка-палітычны аналіз. Кастрычнік 1917–1924 гг.»)  [11]. У працы разглядаюцца два асноўныя працэсы: зацвярджэнне канцэпцыі дыктатуры партыі як вынік палітычных дыскусій аб узаемаадносінах Саветаў і кіруючай партыі; фарміраванне рэжыму партыйнай улады як вынік зацвярджэння канцэпцыі дыктатуры партыі і складвання механізму правядзення партыйнай палітыкі ў дзяржаўных органах. Такая логіка даследавання па сутнасці паўтарае логіку большасці прац папярэдняга перыяду, заўважна змяняецца толькі ацэнка з пазітыўнай на негатыўную. Адзначым, «што такога кшталту тлумачэнні не даюць ніякага разумення працэсу. Для таго каб зразумець гэты працэс, неабходна ачысціць яго ад тых ідэалагічных абалонак, у якіх яго ўспрымалі сучаснікі» [12, с. 229].

Навейшы перыяд расійскай гістарыяграфіі прынёс ў вывучэнне савецкага грамадства і гісторыі яго ўсталявання шэраг новых для яе канцэпцый. Гэта, найперш, «цывілізацыйны падыход» і «канцэпцыя мадэрнізацыі». Яны дазволілі пачаць разгляд праблем гістарычнага развіцця расійскага (і пасля савецкага) грамадства ў больш шырокім кантэксце сусветнай гісторыі. Пры гэтым канцэпцыі разглядаюць істотна інакш ход гістарычнага працэсу, чым, напрыклад, фармацыйная тэорыя, што дазваляе ім аналізаваць тую частку гістарычнай рэальнасці, якая раней не трапляла пад увагу даследчыкаў [13].

Такім чынам, новы перыяд гістарыяграфіі звязваецца з ліберальнымі зменамі, якія распачаліся ў пачатку 1990-х гг., пад іх уплывам вы-

значылася тэндэнцыя да перагляду агульных фундаментальных палажэнняў, што знаходзілі асноўныя тэарэтыка-метадалагічныя характарыстыкі разглядаемага перыяду [14], а таксама распарацоўку прынцыпова новага накірунку даследаванняў, звязанага з вывучэннем рэпрэсіўнай палітыкі савецкай дзяржавы і гісторыі супраціўлення рэжыму [15].

З сярэдзіны 1990-х гг. пачынаецца новы этап сучаснай расійскай гістарыяграфіі. Асобна трэба вылучыць выхад у 1995 г. манаграфіі Е. Г. Гімпельсона «Фарміраванне савецкай палітычнай сістэмы. 1917–1923 гг.». Гэта першая ў савецкай і расійскай гістарыяграфіі спроба пастаноўкі і вырашэння праблемы апісання станаўлення ўсёй савецкай палітычнай сістэмы, а не асобных яе частак.

У азначаны час даследчыкі праяўляюць заўважную цікавасць да пытання кампрамісу бальшавікоў і іншых партый сацыялістычнай арыентацыі, спрабуюць усебакова разгледзець матывы палітычнай дзейнасці небальшавіцкіх рэвалюцыйных сіл [16]. Таксама ў асобны блок можна вылучыць працы, што закранулі аспекты нацыянальнага будаўніцтва народаў Расіі [17].

Адзначым, што за апошнія гады цікавасць гісторыкаў Расійскай Федэрацыі да кола пытанняў, звязаных з рэвалюцыямі 1917 г., не толькі не саслабела, але нават ўмацавалася. Асаблівасцю стала тое, што значную ўвагу пачалі надаваць ужо не столькі палітычнаму напаўненню падзей, колькі асобным аспектам дзяржаўнага будаўніцтва краіны, працы устаноў і органаў улады, узаемаадносінам паміж дзяржавай і іншымі інстытутамі, групамі насельніцтва, развіццю самакіравання, прычым не толькі ў цэнтры, але і на месцах [18].

Як на першым, гэтак і на другім этапе развіцця сучаснай расійскай гістарыяграфіі фактычна адсутнічаюць працы, дзе б меў месца хоць нейкі грунтоўны разгляд падзей 1917 г. на Беларусі ў сувязі з трансфармацыяй дзяржаўнага апарату пад час рэвалюцый 1917 г. Прытым што сучасная расійская гістарыяграфія традыцыйна разглядае беларускія губерні Расійскай імперыі як неад’емную частку краіны ў перыяд рэвалюцый 1917 г. У той жа час заўважнай тэндэнцыяй гэтага гістарыяграфічнага перыяду з’яўляецца тое, што вялікая колькасць прац разглядае пастаўленыя пытанні менавіта ў межах пэўнага рэгіёна (часам асобных губерняў Расійскай імперыі) [19].

У такіх умовах неабходна нагадаць яшчэ раз, што ні ў РСФСР, ні у сучаснай Расіі фундаментальных прац, якія б раскрывалі ўсе механізмы дзеяння органаў улады трох палітычных сістэм (самадзяржаўнай, дэмакратычнай, бальшавіцкай), іх узаемаадносіны, асаблівасці і характар у 1917 г. на Беларусі, не было. А важнасць даследавання гэтай тэмы, як і яе навуковая вартасць, не падлягаюць сумненню, бо беларускія губерні ў 1917 г. знаходзіліся далёка не ў баку ад агульнадзяржаўных падзей, а улічваючы ўмовы прыфрантавой тэрыторыі, асаблівасці ваеннага часу, нацыянальныя аспекты, падзеі трансфармацыі ўлады на Беларусі 1917 г. выглядаюць, бясспрэчна, важнымі для асэнсавання агульнай карціны пераломнага этапу ў жыцці нашага народа.

**Літаратура**


1. Ананов, И. Н. Местные органы Советской власти / И. Н. Ананов. – М.; Л., 1925. – 170 с.; Большаков, А. М. Деревня 1917–1927 гг. / А. М. Большаков. – М., 1927. – 135 с.; Быховский, Н. Я. Всероссийский Совет крестьянских депутатов 1917 г. / А. И. Быховский. – М., 1929. – 243 с.; Владимирский, М. Ф. Организация Советской власти на местах / М. Ф. Владимирский. – М., 1921. – 162 с.

2. Герасимюк, В. Р. Начало социалистической революции в деревне в 1917–1918 гг. / Герасимюк В. Р. – М., 1958. – 265 с.; Гимпель сон, Е. Г. Из истории строительства Советов (ноябрь 1917 – июнь 1918 гг.) / Е. Г. Гимпельсон. – М., 1958. – 305 с.; История гражданской войны в СССР. 1917–1922: в 5 т. Т. 3–5. – М., 1958–1960. – Т. 3: Упрочение Советской власти. Начало иностранной военной интервенции и гражданской войны (ноябрь 1917 г. – март 1919 г.). 1958 – 405 с.; Калинин, Г. С. Великая Октябрьская социалистическая революция и создание Советского государства / Г. С. Калинин. – М., 1959. – 232 с.; Морозов, Б. М. Создание и укрепление советского государственного аппарата (ноябрь 1917 – март 1918 гг.) / Б. М. Морозов. – М., 1957. – 218 с.

3. Абрамов, П. Н. Советское строительство на селе в докомбедовский период / П. Н. Абрамов // Вопросы истории КПСС. 1960. – № 6. – С. 102–108; Абрамов, П. Н. Волостные земства / П. Н. Абрамов // Исторические записки. М.: Наука, 1961. – N 69. – С 56–70; Волобуев, П. В. Экономическая политика Временного правительства / П. В. Волобуев. – М., 1962. – 321 с.; Токарев, Ю. С. Народное правотворчество накануне Великой Октябрьской социалистической революции (март – октябрь 1917 г.) / Ю. С. Токарев. – М.; Л., 1965. – 218 с.

4. Калинин, Г. С. Великая Октябрьская со циалистическая революция и создание Советского государства / Г. С. Калинин. – М., 1959. – 308 с.; Клопов, Э. В. Ленин в Смольном/ Э. В. Клопов. – М., 1965. – 190 с.; Федоров, К. Г. ВЦИК в первые годы Советской власти. 1917–1920 гг. / К. Г. Федоров. – М., 1957. – 270 с.

5. Гусев, К. В. Крах партии левых эсеров / К. В. Гусев. – М., 1963. – 305 с.

6. Дробижев, В. З. Борьба русской буржуазии против национализации промышленности в 1917–1920 гг. / В. З. Дробижев // Истор. зап. Т. 68. – М., 1961. – 345 с.; История профессионального движения в СССР. – М., 1961. – 410 с.; Грифонов, И. Я. Из истории борьбы Коммунистической партии против сменовеховства / И. Я. Грифонов // История СССР. – М., 1959. – № 3. – С. 36–50; Федюкин, С. А. Советская власть и буржуазные специалисты / С. А. Федюкин. – М., 1965. – 258 с.

7. Агалаков, В. Т. Советы Сибири: 1917–1918 гг / В. Т. Агалаков. – Новосибирск. 1978. – 378 с.; Андреенко, Е. Я. Партия большевиков и Советы в первые месяцы диктатуры пролетариата: На материалах Центральной России / Е. Я. Андреенко. – Ростов-на-Дону, 1975. – 314 с.; Андрианов, И. А. Восстановление Советской власти и укрепление ее аппарата в Татарии (1918–1920 гг.) / И. А. Андрианов. – Казань, 1962. – 214 с.: Гимпельсон, В. Г. Советы в годы интервенции и гражданской войны / В. Г. Гимпельсон. – М., 1968. – 190 с.

8. Гимпельсон, Е. Г. Рабочий класс в управлении Советским государством / Е. Г. Гимпельсон. – М., 1982. – 260 с.; История государства и права СССР: в 2 ч. Ч. 2. Советский период. – М., 1981. – 380 с.; История Советского государства и права: в 3 т. Т. 1–3. – М., 1968–1985; Токарев, Ю. С. Роль Советов в судебном строительстве (октябрь 1917 – июнь 1918 гг.) / Ю. С. Токарев // Проблемы государственного строительства в первые годы Советской власти: сб. ст. – Л., 1973. – С. 67 – 76.

9. Второй Всероссийский съезд Советов рабочих и солдатских депутатов. – М.; Л., 1978. – 216 с.; Клеандрова, В. М. Организация и формы деятельности ВЦИК (1917–1924 гг.) / В. М. Клеандрова. – М., 1968. – 128 с.; Проблемы государственного строительства в первые годы Советской власти: сб. ст. – Л., 1973. – С. 213–224; Разгон, А. И. ВЦИК Советов в первые месяцы диктатуры пролетариата / А. И. Разгон. – М., 1977. – 272 с.; Хесин, С. С. Становление пролетарской Диктатуры в России. Вопросы установления Советской власти и складывания пролетарской государственной системы (ноябрь 1917 – март 1918 гг.) / С. С. Хесин. – М., 1975. – 340 с.

10. Минц, И. И. История Великого Октября: в 3 т. / И. И. Минц. 2-е изд. – М., 1977–1979.

11. Агапцов, С. А. Становление партийно-государственной системы власти: (Истор.-полит, анализ, октябрь 1917–1924 гг.): дис. канд. ист. наук / С. А. Агапцов. – М., 1992. – 201 с.

12. Бордюгов, Г. А. История и конъюнктура: Субъективные заметки об истории советского общества / Г. А. Бордюгов, В. А Козлов. – М., 1992. – 229 с.

13. Семенникова, Л. И. Россия в мировом сообществе цивилизаций / Л. И. Семеникова. – М., 1995. – 310 с.

14. Гимпельсон, Е. Г. Формирование советской политической системы: 1917–1923 гг./ Е. Г. Гимпельсон. – М., 1995. – 240 с.; Павлюченков, С. А. Военный коммунизм в России: власть и массы / С. А. Павлюченков. – М., 1997; Шишкин, В. А. Власть, политика, экономика. Послереволюционная Россия (1917–1928 гг.) / В. А. Шишкин. – СПб., 1997. – 212 с.

15. Данилов, А. А. История инакомыслия в России. Советский период / А. А. Данилов. – Уфа, 1995. – 370 с.

16. Шистер, А. Г. Была ли альтернатива вооруженному восстанию? / А. Г. Шистер // Отечественная история. – М., 1990. № 4. – С. 134–145.; Коржихина, Т. П. Первый правительственный кризис / Т. П. Коржихина // Историки отвечают на вопросы. – М., 1990. – С. 229–244.

17. Национальная политика СССР в 1920-е гг. – М., 1996. – 368 с.; Ананичук, В. Я. Закавказье и Северный Кавказ: истоки конфликтности и политика России / В. Я. Ананичук. – М., 1997. – 240 с.

18. Бабкин, М. А. Свержение монархии в России в 1917 г. и православная церковь: дис. канд. ист. наук. / М. А. Бабкин. – М., 2003. – 130 с.; Габисов, А. Г. История политических событий 1917–1920 гг. в национальных республиках Северного Кавказа: дис. канд. ист. наук / А. Г. Габисов. – Владикавказ, 2003. – 140 с.; Пурисова, Г. Ф. Исторический опыт земского самоуправления в России 1866–1918 гг.: дис. канд. ист. наук / Г. Ф. Пурисова. – М., 1996. – 135 с.

19. Оськин, М. В. Государственная власть и крестьянство России в войне и революции: 1914 – октябрь 1917 гг. По материалам черноземных губерний: дис. канд. ист. наук / М. В. Оськин. – М., 2003. – 135 с.; Зигангирова, Г. Р. Система органов местного самоуправления в Казанской губернии в с. XIX – в нач. XX вв.: организация и место в общественно-политической жизни: дис. канд. ист. наук / Г. Р. Зигангирова. – Казань; 2003. – 140 с.; Севастьянов, С. А. Земское самоуправление в Уфимской губернии 1874–1917 гг.: дис. канд. ист. наук / С. А. Севастьянов. – Уфа, 2005. – 130 с.